# МЕТАМЕТАДЫЧНАЯ ПАДРЫХТОЎКА БУДУЧЫХ НАСТАЎНІКАЎ ПАЧАТКОВАЙ ШКОЛЫ

*Л.С. Васюковіч*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Праблема прафесійнай адукацыі будучых настаўнікаў адносіцца да сферы *актуальных* дзяржаўных задач. У кантэксце мадэрнізацыі сістэмы вышэйшай адукацыі галоўным пытаннем застаецца станаўленне маладых педагогаў: менавіта настаўнік з’яўляецца праваднікoм любых навацый. Змест, педагагічныя тэхналогіі патрабуюць дыялектычных трансфармацый, адпаведнасці запытам часу і соцыуму. Змены непасрэдна адбываюцца і ў сферы падрыхтоўкі настаўніка пачатковай школы, у актуалізацыі яго метаметадычнай кампетэнтнасці. *Мэта артыкула*: абгрунтаваць вектары метаметадычнай падрыхтоўкі педагога ў каардынатах развіцця грамадства.

**Матэрыял і метады.** Пра аналізе навукова-метадычнай літаратуры па праблеме даследавання выкарыстаны комплекс метадаў: тэарэтычных (аналіз, абагульненне і сінтэз пазіцый даследчыкаў) і эмпірычных (аналіз нарматыўна-прававых дакументаў сферы адукацыі, вывучэнне педагагічнага вопыту).

**Вынікі і іх абмеркаванне.** На думку даследчыкаў, прадметныя методыкі “выконваюць ролю hard skills, а метаметодыка забяспечвае фарміраванне мяккіх навыкаў (soft skills), навыкаў саманавучання і самаарганізацыі (self-skills), метанавыкаў і агульных спосабаў планавання дзейнасці” [1, с.70]. Укараненне ў многія сферы дзейнасці чалавека робататэхнікі, штучнага інтэлекту не можа не ўплываць на праектаванне стандартаў, адукацыйных праграм падрыхтоўкі настаўнікаў. Фармулююцца новыя патрабаванні да арганізацыі пазнавальнага працэсу, становяцца іншымі навучэнцы, пашыраецца функцыянал сучаснага педагога. Нацыянальная рамка кампетэнцый, распрацаваная спецыялістамі Акадэміі адукацыі, патрабуе ад сучасных педагагічных супрацоўнікаў здольнасцей фарміраваць і ацэньваць універсальныя кампетэнцыі на розных ступенях і ўзроўнях адукацыі (ад дашкольнай да вышэйшай) [2]. Сённяшнія навучэнцы пачатковай школы – дзеці, якія належаць генерацыі Z, маюць характэрныя асаблівасці:

– па-першае, гэта лічбавае пакаленне, што ўспрымае інфармацыю невялікімі часткамі, фрагментамі, якое валодае, на думку псіхолагаў, кліпавым, мазаічным мысленнем, што прыводзіць да фрагментарнасці ва ўспрыманні інфармацыі;

– па-другое, такія дзеці пераважна самацэнтрыраваныя, часта крыўдлівыя, маюць патрэбнасць у пастаяннай увазе, станоўчым ацэньванні;

– па-трэцяе, гэтае пакаленне з цяжкасцю заводзіць сяброў, праяўляе яўную адчужанасць ад іншых дзяцей, маюць праблемы ў кантактаванні з аднагодкамі. Пры гэтым віртуальныя зносіны пераважаюць над рэальнымі;

– па-чацвёртае, для дзяцей гэтага пакалення надзвычай істотныя эмацыянальная афарбаванасць інфармацыі і творчы характар заданняў [3, с.14].

Даследчыкі (Н.В. Барысава, А.А. Вярбіцкі, А.В. Каровін, В.А. Ясвін і інш.) дадаткова вылучаюць шэраг спецыфічных рыс пакалення лічбы: візуальныя вобразы замяняюць кніжны тэкст, які быў звыклым для папярэднікаў; дзеці і падлеткі штодзённа праглядваюць мноства карцінак, таму ў іх расце хуткасць успрымання інфармацыі, але яны з цяжкасцю канцэнтруюць увагу на адным аб’екце; аўтарытэт бацькоў змяншаецца, павялічваецца псіхалагічная дыстанцыя паміж дзецьмі і дарослымі, ускладняецца

працэс перадачы вопыту ад старэйшых да малодшых. Навучэнцы прывыкаюць да сціслых тэкстаў у фармаце навін, іх маўленне адрозніваецца фрагментарнасцю, меркаванні, разважанні часам становяцца павярхоўнымі. Няўменне сканцэнтраваць увагу прыводзіць да таго, што інфармацыя цяжка ўспрымаецца на слых. Павярхоўнае асэнсаванне вуснага і кніжнага слова перарастае ў праблему, якую псіхолагі называюць “сіндромам дэфіцыту ўвагі” [4, с.14].

Метаметадычная падрыхтоўка будучых настаўнікаў як кампанент прафесійнай культуры, паводле пазіцыі І.Ф. Ісаева, В.А. Сласценіна, Я.М. Шыянава, утрымлівае тры састаўныя – *тэхналагічная* (педагагічныя мэты і задачы, педагагічныя сродкі і спосабы дзеяння); *творчая* (актыўнасць, творчае мысленне, узаемадзеянне); *аксіялагічная* (жыццёвыя, сямейныя і прафесійныя каштоўнасці) [5, с.122]. Спынімся на творчым кампаненце, які праяўляецца ў нестандартных адносінах да слова, мовы, да жыцця як каштоўнасці. Крэатыўнасць асобы рэалізуецца праз патрэбнасць у творчым узаемадзеянні з тэкстамі, у змястоўных дыялогах, ва ўменні нестандартна выкарыстоўваць адабраную інфармацыю, структураваць яе як сістэму задач, што абуджаюць думку, пачуцці, развіваюць фантазію, генерыруюць ідэі.

Аднак настаўнік сам павінен мець “паэтычную жылку” (Ф.І. Буслаеў), быць матываваным на стварэнне новага. Адпаведна адной з задач метаметадычнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў з’яўляецца фарміраванне крэатыўнай кампетэнтнасці, якая акцэнтуе асэнсаванае жаданне да самавыражэння, здольнасць выконваць творчыя працы, якія прапануюцца вучням, гатоўнасць арганізаваць і ўвасобіць вынікі дзейнасці ў арыгінальным прадукце, які раскрывае ўнікальнасць, самабытнасць, прафесійную мабільнасць асобы. Напрыклад, цікавая форма развіцця творчасці – падрыхтоўка выказвання, якое прэзентуе эфектыўнасць асобы, паспяховасць маўленчых паводзін як кампанента метаметадычнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў.

Як вядома, прафесія настаўніка знаходзіцца ў зоне павышанай маўленчай адказнасці. Менавіта па гэтай прычыне будучым педагогам так важна навучыцца кампетэнтна і карэктна выбудоўваць канструктыўны дыялог, аналізаваць і перапрацоўваць інфармацыю, валодаць майстэрствам публічнага выступлення. Сярод творчых маўленчых жанраў варта выдзеліць педагагічнае эсэ і відэавізітку (відэарэзюмэ). Відэавізітка як сучасны жанр самапрэзентацыі становіцца ўсё больш запатрабаваным у педагагічнай сферы. Самапрэзентацыя (з лац. – самападача) ставіць за мэту прад’яўленне, рэкламаванне сябе, сваіх здольнасцей, якасцей, дзелавых рыс. Ды і віртуалізацыя сучаснага адукацыйнага працэсу патрабуе належнага пазіцыянавання сябе ў групах, сацыяльных сетках, блогах, уласных сайтах. Відэавізітка можа ўтрымліваць інфармацыю пра асобу, яе навыкі, вопыт працы, захапленні. Яна можа выкарыстоўвацца ў якасці эфектыўнага інструмента фарміравання іміджу, дэманстраваць творчы патэнцыял аўтара, уменне паводзіць сябе перад аўдыторыяй, выяўляць культуру маўлення асобы. Тэмы такога прадстаўлення могуць быць рознааспектнымі: “Чаму я выбраў прафесію настаўніка пачатковай школы?”, “Я – студэнт Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава”, “Мая педагагічная дынастыя”, “Маё хобі”, “Я – сённяшні і будучы” і інш.

Цікавасць узрастае, калі кожны са слухачоў выступае ў ролі члена журы, ацэньвае відэавізітку па калектыўна распрацаваных крытэрыях: адпаведнасць зместу заяўленай тэме, логіка і структураванасць выступлення, арыгінальнасць задумы і яе рэалізацыя, культура і эмацыянальнасць маўлення, дызайн і мантаж відэа. Разуменне асаблівасцей жанру, відэавізіткі як сродку самапрэзентацыі развіваюць творчыя ўменні студэнтаў, іх пазнавальны інтарэс да традыцыйных дысцыплін, рыхтуюць будучых педагогаў да выклікаў сучаснага свету, фарміруюць канкурэнтаздольнасць.

Састаўной часткай метаметадычнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў выступаюць лінгваметадычныя задачы – разнавіднасць творчых заданняў, што праектуюць педагагічную дзейнасць. Такія задачы мадэліруюць сітуацыі, максімальна набліжаныя

да рэальных, забяспечваюць назапашванне станоўчага прафесійнага вопыту, пераключаюць метадычную дамінанту з працы педагога на актыўнасць студэнтаў. Перспектыўным у гэтым аспекце з'яўляецца прымяненне праектнага метаду, у аснове якога – развіццё ўменняў канструяваць, інтэграваць веды сумежных дысцыплін, арыентавацца ў шматфарматным прадстаўленні інфармацыі. Так, знаёмства з выданнямі для маленькіх чытачоў ставіць за мэту стварэнне канечнага прадукту – арыгінальнае вуснае паведамленне пра дзіцячы часопіс. Задума праекта: прэзентацыя любімага дзіцячага часопіса перад школьнікамі. Спектр заданняў у працэсе выканання праекта можа быць такім: наведванне бібліятэкі, складанне спісу дзіцячых часопісаў, знаёмства з канцэпцыяй, гісторыяй стварэння выдання, падрыхтоўка цікавых пытанняў для членаў рэдакцыі, спецыфіка структурных элементаў: вокладка, форзацы, ілюстрацыі, змест, стратэгія і тактыка арганізацыі чытацкай дзейнасці, рубрыкі, аўтары публікацый, дадатак, эстэтыка афармлення, структура сайта выдання.

**Заключэнне.** Такім чынам, пад уздзеяннем актыўнага распаўсюджвання лічбавых тэхналогій сфарміравалася пакаленне, якое патрабуе абноўленых падыходаў да навучання. Дыдактычныя магчымасці лічбавага асяроддзя актуалізуюць інфармацыйна-камунікацыйныя працэсы, арыентаваныя на патрэбнасці і запыты сённяшняга/заўтрашняга студэнта, трансфармуюць фармат і структуру прадстаўлення вучэбнага кантэнту ў лічбавым фармаце, змяняюць функцыі педагога, праектуюць індывідуальныя адукацыйныя траекторыі навучэнцаў. Аднак, нягледзячы на яўныя перавагі (дыдактычныя, метадычныя) лічбавых адукацыйных платформ, яны павінны ацэньвацца як інструменты арганізацыі пазнавальнай дзейнасці і не могуць выступаць у якасці прыярытэтаў, якія дамінуюць над духоўнай місіяй выкладчыка. Рэдуцыраванне, недаацэньванне статусу педагога, звядзенне яго да ўзроўню рэгістратара з'яўляецца метадалагічна не апраўданым.

Для эфектыўнай метаметадычнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў павінна ствараецца прафесійнае асяроддзе, у якім пераважае крэатыўны пачатак. Толькі ў творчых умовах адбываецца паўнацэнная самаактуалізацыя педагога, здольнага паспяхова ўзаемадзейнічаць з дзецьмі пакалення Z. Падчас студэнцтва назапашваецца вопыт рашэння лінгваметадычных задач, якія імітуюць рэальныя педагагічныя сітуацыі, набываецца вопыт удзелу ў праектах. Творчыя заданні спрыяюць станаўленню індывідуальнасці, павышаюць матывацыю, фарміруюць навыкі шматфактарнага аналізу і вырашэння пазнавальных і жыццёвых праблем. Калектыўныя праекты развіваюць навыкі крытычнага мыслення, выпрацоўваюць базавыя ўменні: абгрунтаванне актуальнасці тэмы праекта, складанне анатаванага бібліяграфічнага спісу літаратуры, адбор рэлевантных крыніц, падрыхтоўка рэзюмэ, напісанне тэзісаў для студэнцкай канферэнцыі, прэзентацыя вынікаў, іх ацэнка па калектыўна распрацаваных крытэрыях, абмен вопытам у выкарыстанні штучнага інтэлекту ў прафесійнай дзейнасці, SWOT-аналіз, які ацэньвае пагрозы, моцныя і слабыя аспекты прымянення штучнага інтэлекту, агляд сервісаў для настаўнікаў, генерацыя сучаснага кантэнту, магчымасці персаналізацыі навучання. Падрыхтоўка будучых настаўнікаў спрыяе іх самарэалізацыі ў далейшай кар'еры. Каштоўнасці, жыццёвы вопыт, светапоглядныя ўстаноўкі выступаюць надзейным базісам паспяховай інтэграцыі педагога ў кантэкст асобасна-прафесійнай культуры, адным з кампанентаў якой з'яўляецца арыентацыя на творчасць.

1. Поздеева, С.И. Метаметодика как основание построения обучающей деятельности / С.И. Поздеева, О.А. Чубыкина // Научно-педагогическое обозрение. – 2020. – № 6. – С. 67–72.
2. Особенности формирования универсальных компетенций обучающихся:целевые показатели и ожидаемые результаты // Веснік адукацыі. – 2025. – № 5. – С. 6 – 19.
3. Сапа, А.В. Поколение Z – поколение эпохи ФГОС / А.В. Сапа // Педагогическая мастерская. – 2015. – № 7. – С. 7 – 15.
4. Чутко, Л.С. Синдром дефицита внимания с гиперактивностью и сопутствующие расстройства. – Тюмень, 2015. – 208 с.
5. Сластенин, В. А. Педагогика: учебник / В.А. Сластенин [и др.]. – М.: Академия, 2016. – 543 с.